# Як сьвяткаваў Чэрвеньскі павет

**В. Цытва**

У аўторак вечарам 6–га лістапада ў клюбе–тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэньне ўстановаў мяйсцовай улады, пасьвячонае 6–ай гадавіне Пралетарскай рэвалюцыі. Выступала шмат прамоўцаў.

Камсамольцы саўхозу Цытва пастанавілі дарэмны спэктакль.

Днём 7–га лістапада агульнаваласны мітынг пачаўся пазьней, як трэба, з прычыны пажару ў в. Цытве. Вёска загарэлася ў чацьвёртай гадзіне па поўначы, у той час, як людзі яшчэ спалі. Страшэнны вецер умомант раскінуў агонь на 28 гаспадароў, будовы якіх за 2 гадзіны згарэлі датла. Ахвяры і шкоды пажару не паддаюцца падліку.

Але гэта няшчасьце не пашкодзіла сьвяткаваньню.

Кругом трыбуны былі пастаўлены роты чырвонаармейцаў–пераменьнікаў і дапрызыўнікаў 2 роты, якімі камандаваў чырвоны афіцэр 5–га палка. Была строгая праверка і пераклічка, і, калі ўсё было прыведзена ў парадак, зьявіліся прадстаўнікі–прамоўцы. Старшыня Вал[аснога] Вык[анаўчага] К[амітэ]ту Шэлег, прыняўшы ад начальніка параду рапарт, прывітаўся з чырвонымі байцамі і адчыніў мітынг. У кароткіх рысах ён адзначыў гістарычны факт 7 лістапада 1917 г. — пабеднай барацьбы пралетарыяту Расеі і першае ў сьвеце ўтварэньне Рабоча–сялянскага ўраду. Пры гэтым т. Шэлег абвясьціў чырвоным ваякам, што Цытаўскі Валвыканком па даручэньню цэнтру сягоньня прыймае шэфства над чырвонымі міліцыйнымі ротамі валасной тэрыторыі і шчыра вітаў быўшых і будучых ваякоў за вечны мір і за лепшую долю працоўнае клясы.

Потым казалі прамоўцы з м. Чэрвеня: Чорны і Аленькаў, зачапіўшы галоўнейшыя моманты з пэрыяду шасьцёхгадовага „младзечанства“ Сав[ецкай] улады.

Ня лішні раз тлумачылі і аб саюзе працы і навукі.

Шмат было зьвернута ўвагі на сучасны ход рэвалюцыі ў Нямеччыне.

Усе прамоўцы былі вельмі змардаваны ад працы на пажары і не маглі моцна на паветры гаварыць, а затым мітынг (на адкрытым паветры) хутка зачыніўся. Пераменьнікі і дапрызыўнікі пад камандай пайшлі ў клюб і ў школу, дзе ўрачыстае пасяджэньне йшло некалькі гадзін.

Тут жа было разьвязана некалькі пытаньняў практычнага характару: дапамога няшчасным пагарэльцам, найхутчэйшае самааблажэньне па рамонту пажарных насосаў, павялічыць дысцыпліну начной варты і інш.

Вечарам гэтага дню сіламі перадавых культурнікаў ставілася драма „Катаржнік“.

*1923*